ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

...лянская моладзі Беларусі

Чырвоная Зьмена

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 72 (454) Пятніца 1 ліпеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у сераду, пятніцу і нядзелю | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. №903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена": Менск, Комсам. 25.

...сім Акругкомам, Райкомам, ячэйкам і членам ЛКСМБ

Дарагія таварышы!

...ліпені месяцы Комсамолу Беларусі ...таіць прыняць актыўнейшы ўдзел у ...дзеньні 2-х важнейшых палітычных ...ній:

...11-га ліпеня спаўняецца 7 гадоў ...вызваленьня Беларусі ад белапа... і з 10-га па 17-е ліпеня право... Тыдзень абароны СССР.

...У дакладах на масавых сходах ра...ча-сялянскай моладзі, на сходах ячэек ЛКСМ, прысьвечаных 11 ліпеня, асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на растлумачаньне наступных асноўных момантаў:

1. Правядзеньне нашай партыяй нацыянальнай палітыкі, накіраванай да ...вабоднага разьвіцьця нацыянальнай культуры усіх нацыянальнасьцяў, якія на...ляюць БССР, і шпаркага ўздыму разь...ьця культурнага і гаспадарчага будаў...

...Нашы чарговыя задачы у галіне ...дарчага і культурнага будаўніцтва.

...Сучаснае становішча буржуазнай ...ячы, асабліва Заходняй Беларусі, ...ечы ў ёй нацыянальны ўціск над беларусамі, украінцамі і іншымі працоўнымі ...ольскай нацыянальнасьці.

...Сучаснае міжнароднае становішча ...Р і падрыхтоўка імпэрыялістых на ...але Англіі да ваеннага нападу на СССР. Нашы задачы у справе абароны і ваенізац...і Комсамолу.

...Тыдзень абароны» кожная арганізацыя, кожная комсамольская ячэйка, ...рыўшы ужо прароблевае, павінны:

1. Яшчэ мацней зьвязацца з Чырвонай арміяй шляхам масавых паходаў у лягеры і казармы, супольных вайсковых гульняў і вечароў, успамінаў аб гараічных днёх Чырвонай арміі.

2. Узварушыць кожную ячэйку ТСА-Авіяхіму, арганізаваць новыя ячэйкі, прыняць захады да зьліквідаваньня запазычанасьці па членскім узносам, пашырыць распаўсюджваньне ТСААвіяхімаўскай літаратуры, газэт, часопісяй. Калі магчыма, арганізаваць манэўры па газавай абароне.

3. Арганізаваць новыя стралковыя гурткі, тыры, конкурсы на лепшага стралка, гурткі вайсковых ведаў, разведчыкаў, плянэрыстых, модэлістых, авіяхім каманды, — прыцягнуць да ўсёй гэтай справы самыя шырокія масы рабоча-сялянскай моладзі.

4. Арганізаваць абучэньне моладзі верхавой язьдзе, заняткі па зазьняцьцю мясцовасьці, вывучаньню вінтоўкі, кулямёту.

5. Асаблівую ўвагу зьвярнуць на арганізацыю гурткоў санітарак, уцягненьне у іх, як і ва ўсю правадзімую работу, дзяўчат.

6. Узмацніць збор сродкаў на пабудову самалёту ТСААвіяхіму Беларусі, арганізуючы з гэтай мэтай зборы, выклікі, вечары і г. д.

ЦК заклікае усіх комсамольцаў да усебаковай падрыхтоўкі вызначаных мерапрыемстваў.

У газэтах «Чырвоная Зьмена», «Юнгер Арбэйтэр» мы друкуем тэзісы дакладаў і асноўны прапагандысцкі матар'ял.

Сакратар ЦК ЛКСМБ **Галавач**.

Скончыўся пленум ЦК УсеЛКСМ

...З 17-га па 20-е чэрвеня адбыўся ...пленум ЦК УсеЛКСМ. Пленум раз...дзеў шэраг важнейшых пытаньняў: ...Даклад «Аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР» (тав. **Молатаў**), ...Даклад аб пленуму Комінтэрну і задачах адбываўшагася пленуму КІМ'у (тав. **Шацкін**), 3) Пытаньні юнацкай працы: ...аб броні, б) аб сыстэме аплаты працы вучняў (т. т. Завялаў і Жданаў), 4) ...б высоўваньні і спэцыялізацыі актыву (тав. **Косараў**), 5) аб паляпшэньні працы апарату ЦК і мясцовых камітэтаў (тав. **Міслаўскі**), 6) аб чарговым зьезьдзе саюзу і 7) аб зьменах у складзе бюро і сакратарыяту ЦК.

Па дакладам т. т. **Молатава і Шацкіна**, пленум аднагалосна **поўнасьцю далучыўся да ўсіх рашэньняў апошняга пленуму Выканкому Комінтэрну і зьвярнуўся да Цэнтральнага Камітэту Партыі з просьбай прыняць рашучыя меры да зьнішчэньня раскольніцкай дзейнасьці опозіцыі.**

Адзначыўшы абвастрэньне ваеннай небясьпекі, **пленум вызначыў шэраг мерапрыемстваў па ўдзелу комсамолу за ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны і ваеннай падрыхтоўкі моладзі.**

Цэнтральнае месца сярод экономічных пытаньняў на пленуме заняло пытаньне **аб новай норме броні падросткаў.** Пленум зацьвердзіў асноўныя прынцыпы перагляду броні, выходзячы з патрабаваньняў прамысловасьці і аднаўленьня кваліфікаванай рабочай сілы.

Пленум прызнаў, што **праца па перагляду нормаў броні павінна быць скончана да 1-га студзеня 1928 г.,** з тым каб увесьці іх у жыцьцё ужо з 1927/28 гаспадарчага году. **Размер броні 1927-28 г. павінен быць зьніжан ня больш, чым на 30 проц.** прычым зьніжэньне гэтае павінна быць праведзена не за лік звальненьня падросткаў, а шляхам пераводу ў штаты маючыхся падросткаў і абмежаваньня новага прыёму падросткаў.

Выходзячы з правадзімай УсеЦСПС тарыфнай рэформы, пленум ЦК выказаўся за ўвядзеньне асобай тарыфнай сеткі для вучняў пры абавязковай умове захаваньня існуючага ўзроўню зарплаты вучняў. Пленум ЦК прызнаў, што вучнёўская сетка, як правіла, павінна распаўсюджвацца як на вучняў ФЗВ, так і на вучняў індывідуальна-брыгаднага вучнёўства.

Пленум вызначыў у якасьці орыэнтыровачнага тэрміну 8-га чарговага Зьезду Саюзу—люты месяц, з тым, каб мясцовыя конфэрэнцыі былі праведзены ў сьнежні-студзені.

У сувязі з уходам некаторых сяброў Бюро Цэнтральнага Камітэту на вучобу—пленум унёс шэраг зьмен у склад бюро і сакратарыяту ЦК. Бюро ЦК складзена з 17 таварышоў: Чаплін, Кудраўцаў, Грыгор'еў, Собалеў (Ленінград), Косараў (Масква), Курнікаў (заг. орг. разьмярк.), Розенка (заг. агітпроп), Шарудзіла (эк. камісія), Ярогаў (заг. школьным аддзелам), Шацкін (КІМ), Салтанаў (ЦП ЮП), Кастроў («Комс. Праўда»), Мільчакоў (ЦК КСМУ), Ханін (Аддзел Друку), Ерамеяў (Вайсковая камісія), Балтрукевіч (спорткамісія), Васільеў (МК). Кандыдаты т. т.: Жданаў (УсеЦСПС), Паўлаў (Спортінтэрн), Гарлоў (КІМ), Носаў (МК).

Сакратарыят ЦК зацьверджан у складзе т. т.: Чаплін, Кудраўцаў, Грыгор'еў, Собалеў і Косараў.

На пленуме Выканкому КІМ'у

18 чэрвеня ўступнай прамовай сакратара Выканкому КІМ'у тав. Шацкіна пачалася работа чарговага пленуму ВККІМ. ...а першым пасяджэньні пленуму вы...у з дакладам аб выніках пленуму ...каному Комінтэрну тав. Мануільскі.

У асяродку дыскусіі, па гэтаму дакладу, сталі: кітайскае пытаньне і новыя фракцыйныя выступленьні опозіцыі УсеКП(б). **Усе таварышы, якія выступалі ў спрэчках, рашуча асуждалі фракцыйнае выступленьне т. т. Троцкага і Вуёвіча на пленуме ВККІ і аднагалосна выказаліся за рэзолюцыі пленуму ВККІ.**

20 чэрвеня быў заслуханы даклад Шыльлера. Тав. Шыльлер даў агляд антымілітарыстычнай работы сэкцый КІМ'у ў сувязі з пагрозай новых войнаў. Тав. Шыльлер таксама ахарактарызаваў адносіны да пытаньня аб вайне II Інтэрнацыяналу і Соцыялістычнага Інтэрнацыяналу Моладзі.

У сваім дакладзе ён адзначыў асноўную розьніцу цяперашняй устаноўкі соцыял-дэмократыі ад позіцыі яе да сусьветнай вайны 1914 году. Стары соцыял-дэмократычны пацыфізм ператварыўся ў адкрыты соцыял-шовінізм. Праз тэорытычнае прызнаньне надклясавай дзяржавы соцыял-дэмократыя перашла да тактычнага апраўданьня абароны «бацькаўшчыны».

З садакладам аб практычных мерапрыемствах па барацьбе з ваеннай небясьпекай выступіў тав. Бію.

З дакладам аб капіталістычнай рацыяналізацыі, становішчы моладзі і працы у профсаюзах—выступіў тав. Янг.

У сваім дакладзе тав. Янг даказаў, што капіталістычная рацыяналізацыя не памяншае ролі рабочай моладзі.

Небясьпека разгрому профсаюзаў Англіі

Новы проэкт закону ўраду—сьмяротныя ціскі дзеля рабочага руху

Хочуць загнаць у пятлю

Новы проэкт закону аб ангельскіх профсаюзах

Вядомая майская стачка ангельскіх рабочых у 1926 годзе кончылася тым, што прадпрыемцы найбольш важных галін гаспадаркі заключылі з саюзамі чыгуначнікаў (дзе кіравалі здраднікі Томас і Бэвін) згоду, па якой саюзы гублялі права ўдзельнічаць у забастоўцы.

Консэрватары на конфэрэнцыі сваёй партыі ўхвалілі патрабаваць ад ураду аб'явы аб незаконнасьці ўсеагульнай стачкі, кантролю за грашовымі сродкамі профсаюзаў, забароны далучэньня профсаюзаў да рабочай партыі.

Урад прыняў гэты проэкт і вылучыў камісію дзеля перагляду закону аб профсаюзах.

Зламаўшы забастоўку вуглякопаў рукамі профсаюзнай бюрократыі і рабочай партыі, урад перашоў у наступ супроць рабочых, адкінуўшы далейшую дапамогу ў гэтым Макдональда і другіх здраднікаў, унёсшы проэкт закону аб профсаюзах у парлямант.

Першы пункт законапроэкту забараняе стачкі. Гэта зьяўляецца пакусай на самую сутнасьць рабочага руху, гэта зьвязвае рабочага па руках і нагах, і фактычна падрывае і раскідае самыя профсаюзы, як гэтакія. Рэшта пунктаў забараняе прасьледваньне штрэйкбрэхэраў, забараняе ўступленьне профсаюзаў у рабочую партыю, ад чаго апошняя будзе падрывацца, бо ўся яе грашовая моцнасьць залежыла ад профсаюзаў. Закон забараняе ўступленьне служачым дзяржавы ў профсаюз.

„Ахова працы" па ангельскі

Пасьля такіх рэпрэсый рабочая партыя і профсаюзы павінны будуць перайсьці на індывідуальнае сяброўства—фактычна--падрыў у самай аснове усяго профсаюзнага руху Англіі.

Абурэньне рабочых мас супроць законапраэкта надта вялікае, але профсаюзныя бюрократы іграюць у дудку ўраду.

Ангельскай рабочай клясе пагражае чорная небясьпека рэакцыі.

СССР мала страціць ад спыненьня гандля з Англіяй.

Заява т. Хінчука прадстаўніку ТАСС.

Ранейшы гандлёвы прадстаўнік СССР у Англіі, т. Хінчук, які ўжо вярнуўся ў Маскву, на запытаньни супрацоўніка ТАСС, ці страцім мы на якасьці тавараў, калі перакінем нашы заказы ў іншыя краі, заявіў:

«У індустрыяльным разьвіцьці Англіі наглядаецца затрыманьне і страта тэмпу ў параўнаньні з іншымі прамысловымі краямі: Амэрыкай, Нямеччынай, Францыяй і інш. Прычыны гэтага зьявішча трэба шукаць пераважна ў цьвёрдалобым консэрватызьме, які так часта перашкаджае Англіі разумець яе жыцьцёвыя інтарэсы.

Нашы страты ад пераразьмеркаваньня нашых заказаў на іншыя краі будуць нязначнымі і выявяцца хутчэй у нявыгодах, чымся ў рэальных стратах.

Ці можам мы спадзявацца і ў іншых краёх на такія-ж крэдытныя ўмовы, якія мы мелі ў Англіі?

«Ангельскі урад,—адказвае т. Хінчук, —ужо некалькі гадоў рабіў сур'ёзны нажым на фінансавыя і камэрцыйныя колы Англіі і іншых краёў, каб перашкодзіць нам атрымаць крэдыты. Гэты нажым, у зьвязку з разрывам, павялічыцца, але мы, у свой чарод, павінны павялічыць нашу ўважлівасьць, каб быць гатовымі да спробаў цьвёрдалобых пагоршыць наша крэдытнае становішча ў іншых краёх.

Аднак, шмат ангельскіх фірм прапануе нам ня прадаўжаць справы на ранейшых умовах пры пасрэдніцтве іншых краёў, а наколькі гэта так, дык чужаземныя фірмы павінны будуць у моц канкурэнцыі і ўласнае камэрцыйнае выгады надаць жаданыя для нас крэдытныя ўмовы.

Ангельскі ўрад няшчыра заяўляе, што гандаль з СССР можа адбывацца далей і пасьля разрыву. Аднак, нашы контр-агенты павінны будуць пераканацца, што да іх не наступіць ні воднага заказу, пакуль ангельскі ўрад не адновіць ранейшага становішча, якое было перад наскокам, і не забясьпечыць магчымасьці нармальнае і спакойнае працы.

Як падрыхтоўвалася паездка Ангельскай дзічачай дэлегацыі.

Яны паехалі 21-га на параходзе «Юшар», пакінуўшы ў аддзеле пашпартоў міністэрства замежных спраў «заяву шасьці», з яснай рэзолюцыяй: «Адмовіць паўторна».

3-га чэрвеня ў Цэнтральнае Бюро піонэраў у Лёндане прынесьлі вялікі пакет з савецкай маркай. Гэта была запросіна Маскоўскай конфэрэнцыі юных піонэраў прысылаць дэлегацыю ангельскіх дзяцей у СССР.

Запрашаньне было прынята. У самых буйных прамысловых раёнах Англіі адбыліся 32 выбарчых конфэрэнцыі і 8-га чэрвеня ў Нью-Кастле на 2-тысячным сходзе школьнікаў, дзяцей рабочых, піонэраў і дзяцей соцыялістычных організацый абралі першую дэлегатку Нэнсі Хол, 13 год.

Тав. Кук пасьля заявы лёрда Пэрсіі (дырэктара аддзелу сярэдне-навучальных устаноў міністэрства асьветы) аб тым, што ўсе дэлегаты будуць выключаны са школ, сказаў:

-- У ліку дэлегатаў паедзе мой малодшы сын. Гэтым я хочу сказаць профсаюзным правадыром, якія спрабуюць недапусьціць паездку дзяцей у СССР, што, акрамя добрага, дэлегатаў у Савецкім Саюзе нічога не чакае.

14-га, увечары, у памяшканьні лепшага клюбу лёндаскіх профсаюзаў ужо адбыўся мітынг протэсту супроць забароны выезду дэлегацыі з Англіі. Усе 6 дэлегатаў былі ўжо ў поўным зборы, прычым на мітынгу прысутнічала 48 дэлегатаў другога агульна-ангельскага зьезду піонэраў. Мітынг зноў узьняў перад міністрам замежных спраў хадайніцтва аб выдачы віз. 17 быў зноў атрыманы адказ.

Тады на сходзе лёндаскіх організацый піонэраў хтосьці прапанаваў:

--Едзем бяз віз. І паехалі.

* * *

Зараз гэтая дэлегацыя ангельскіх дзяцей знаёміцца з жыцьцём Савецкага Саюзу.

Усе сілы рабочых Скандынавіі на абарону СССР

Кампанія Скандынаўскіх компартый

Конфэрэнцыя шведзкае, нарвэскае і дацкае компартый у Капэнгагене выпусьціла адозву да скандынаўскіх рабочых, у якой, зазначаючы на шаленую кампанію буржуазнага і соцыял-дэмократычнага друку проці СССР, заклікае рабочыя масы ўсьвядоміць сабе сур'ёзнасьць становішча і падрыхтавацца да барацьбы проці вайны.

„Кожная фабрыка, кожны завод павінны быць падрыхтаваны—гаворыцца ў адозве—**усе профсаюзы павінны быць мабілізаваны на барацьбу проці вайны. Скандынаўскія рабочыя павінны аб'яднацца навакол лёзунгу нязрушанае салідарнасьці з СССР і кітайскай рэволюцыяй".**

Саюз „Кляртэ" папераджае аб пагрозе вайны

У Стакгольме адбылася конфэрэнцыя шведзкага, нарвэскага, дацкага і фінляндзкага філіялаў групы „Клярта".

На конфэрэнцыі абгаварвалася пытаньне аб міжнародным становішчы. У аднагалосна ўхваленай рэзолюцыі па гэтым пытаньні падкрэсьліваецца, што англа-савецкі канфлікт можа выклікаць сусьветную вайну, прычым Швэцыя і іншыя паўночныя краі могуць быць уцягнуты ў барацьбу проці СССР. Небясьпека гэтая павялічваецца яшчэ прапагандай, якая праводзіцца буржуазным друкам. Паўночны саюз «Клярта»—гаворыцца ў рэзолюцыі—заклікае рабочую клясу і ўсе свае аддзяленьні напружыць усе сілы для проціздзейнічаньня гэтай небясьпецы, разгарнуць шырокую агітацыю проці ваеннае небясьпекі і мабілізаваць інтэлігэнцыю для барацьбы за соцыялізм і мір».

Шлях Чэмбэрлена

(Распаўсюджаны від турызму ў Англіі)

аванТУРЫЗМ

Фынь-Юй-Сян і Чан-Кай-Шы

Поруч з тэлеграмаю, якую Фынь-Юй-Сян і Чан-Кай-Шы паслалі супольна у Ханькоу і тэлеграмаю Фынь-Юй-Сяна, газэты зьмяшчаюць таксама прамовы Фынь-Юй-Сяна, Чан-Кай-Шы і Ху-Хан-Міна. Першыя двое гаварылі аб барацьбе проці імпэрыялізму і патрэбе заўладаць Пекінам. Ху-Хан-Мін у сваёй прамове заявіў, між іншым: «Абодвы вайсковыя правадыры аб'ядналі свае сілы ў імкненьні скасаваць комуністычную партыю скончыць нацыянальную рэволюцыю».

У зьвязку з гэтым узмоцнена запрацаваў аддзел прапаганды нанкінскага ўраду. Распаўсюджваюцца чуткі аб перапудзе ў Ханькоу, аб надыходзячым паходзе Фынь-Юй-Сяна, Чан-Кай-Шы і Ен-Сі-Шана на Ухан, аб высылцы Ван-Цьзін-Вэя, аб тым, што Тан-Шэн-Чы падрыхтоўвае пераварот.

Нанкінскі ўрад зьвярнуўся з адозвай да жыхарства правінцыі Хубэй і Хэнань, у якой зьмешчана шмат паклёпаў і абвінавачваньняў на комуністычную партыю.

Самі наб'ем мы патроны, да ружжаў прывінцім штык

Комсамолец змагаецца за вайсковую вучобу. Наш адказ Чэмбэрленам--- тысячы комсамольцаў---стралкоў

Матар'ялы для дакладчыкаў па кампаніям „Наш адказ Чэмбэрлену“ і „Тыдзень абароны“.

Апошнія рашэньні 8-га пленуму Выканкому Комінтэрну, яго зварот да працоўных усяго сьвету, адозва нашай партыі «да ўсіх сваіх організацый, да ўсіх рабочых і сялян» і «ўрадавае паведамленьне» ад 8-га чэрвеня 1927 году ва ўсёй вастраце паставілі пытаньне аб небясьпецы новай імпэрыялістычнай вайны і падрыхтоўкі новага ваеннага нападу на Саюз Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Капіталістычная Англія робіць усё магчымае, каб знайсьці прадлог і пачаць вайну з Саветамі. Пад кіраўніцтвам Англіі праведзен напад на савецкае прадстаўніцтва у Пекіне, адбыўся налёт на гандлёвае прадстаўніцтва СССР у Лёндане. Бяз усякіх падстаў і апраўданьняў ангельскі консэрватыўны ўрад парваў дыплёматычныя зносіны з Савецкім Саюзам.

Англія актыўна працуе па організацыі блёку некалькі дзяржаў для нападу на нас. Мы зьяўляемся сьведкамі гнусных удараў з-за кутка, якім зьяўляецца забойства тав. Войкава, нашага паўнамоцнага прадстаўніка ў Польшчы, мы зьяўляемся сьведкамі новых контр-рэволюцыйных загавораў і тэрорыстычнай працы нашых заклятых ворагаў-белагвардзейцаў на тэрыторыі СССР. Усё гэта робіцца пад кіраўніцтвам капіталістычнай Англіі. Усё гэта робіцца для таго, каб як можна хутчэй уцягнуць Савецкі Саюз у вайну.

Словы і справы капіталістых

Капіталісты нямат гаварылі і гавораць аб разбраеньні. Але усё гэта толькі на словах. Усе прапановы і заявы ў гэтым напрамку зьяўляюцца вялікім ліцамер'ем і зьдзекваньнем. На справе капіталістычныя ўрады ўсіх краін прадаўжаюць ліхарадачна ўзбройвацца. Імі робіцца ўсё для таго, каб павялічыць ваенныя бюджэты, узмацняць тэхнічнае ўзбраеньне сваіх армій і павялічваць колькасьць апошніх.

Ваенныя бюджэты

У 1913 годзе ваенныя бюджэты Англіі, Францыі, Італіі, Нямеччыны, Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, Японіі складалі 2 мільярды 800 мільёнаў рублёў, а у 1926 годзе яны вылічаюцца лічбай у 4 мільярды 281 мільён рублёў. Адбылося павялічэньне ваенных бюджэтаў амаль што на 70 проц.

Сухапутныя арміі

У 1913 годзе Англія, Францыя, Італія і Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты мелі у сухапутнай арміі 1.413.000 чал., у 1923 годзе—1.681.000 і у 1926 годзе—1.821.000.

Марскі і паветраны флёты

Програма марскога судабудаўніцтва Брытанскай імпэрыі мае на ўвазе за час з 1922-23 г. да 1932-33 г. павялічэньне «лёгкіх» марскіх сіл: надводных—на 54 проц., падводных—на 45 проц.; Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты маюць на ўвазе адпаведнае павялічэньне на 24,5 проц. надводных і на 14 проц. падводных; Японія—на 80 проц. надводных і на 72 проц.—падводных; Францыя—на 300 проц. надводных і на 200 проц. падводных; Італія—на 115 проц. надводных і на 122 проц. надводных. Паветраны флёт Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, Англіі, Францыі і Італіі вырас з 150 адзінак у 1923 годзе да 3.550 адзінак у 1926 годзе, гэта значыць павялічыўся у 20 разоў.

З ня меншай інтэнсыўнасьцю вядзецца падрыхтоўка і да хэмічнай вайны з боку ўсіх капіталістычных дзяржаў.

Вытворчасьць хэмічных сродкаў спусташэньня надзвычайна шпарка ўзрастае ва ўсіх капіталістычных краінах.

У Францыі вытворчасьць зьвязанага азоту, неабходнага для ўзрыўчатых і атручваючых матэрый, без якога, як вядома, ні адна армія ня зможа ваяваць,--дасягае 200.000 тон у год. Вытворчасьць хлору дасягае 25.000--30.000 тон у год.

У Англіі красачная прамысловасьць была слаба, цяпер пакрывае 80 проц. патрабаваньняў краіны.

На ваенна-хэмічныя дасьледваньні ў Японіі адпушчана на год 5.000.000 залатых рублёў.

Польшча таксама зрабіла вялікія посьпехі ў разьвіцьці хэмічнай прамысловасьці. Гадавая вытворчасьць зьвязанага азоту ў Польшчы дасягае [illegible]000 тон.

Ваенна-грамадзкія організацыі ў капіталістычных краінах.

Але гэта ня ўсё. Буржуазія будуе свае уласныя клясавыя ваенна-грамадзкія організацыі.

З розных ваенна-грамадзкіх організацый буржуазіі, неабходна адзначыць наступныя: «Добраахвотная міліцыя нацыянальнай бясьпечнасьці» (фашысцкая міліцыя) у Італіі налічвае да 300.000 чал. Ваенна-грамадзкія організацыі ў Фінляндыі—«Шюцкор» з жаночай дапаможнай організацыяй пры ім, стралковы саюз, Таварыства афіцэраў рэзэрву, саюз паветранай абароны і таварыства марскіх афіцэраў,—складаюць звыш 100.000 чалавек; «Ліга абароны» у Эстоніі—ня менш 25.000 чалавек; «Латвійская організацыя абароны»--30.000 чал.; «Стралковы саюз» у Польшчы--250.000 чал.

Побач з адзначанымі ваенна-грамадзкімі організацыямі, у капіталістычных краінах існуюць яшчэ разнастайныя органы па ваенізацыі насельніцтва **элемэнты ваеннай падрыхтоўкі ўзмацнёна ўводзяцца ва ўсю фізычную падрыхтоўку моладзі.** Сярод апошняй праводзіцца спэцыяльная ваенная падрыхтоўка. Падручнікі, вызначаныя для грамадзянскіх школ, напаўняюцца вайсковым зьместам. Вялікая праца праводзіцца па падрыхтоўцы жанчын да вайны. Капіталісты імкнуцца ператварыць усю краіну ў баяздольную армію.

Працягваць політыку міру і ўзмацняць абароназдольнасьць краіны.

4-ты ўсесаюзны зьезд саветаў у сваёй рэзолюцыі па дакладу Наркамваенмору тав. Варашылава кажа: «што (зьезд) зноў пацьвярджае няўхільную волю працоўных Савецкага Саюзу к міру і ўзмацненьню таварыскіх адносін з усімі дзяржавамі». Мы за мір. Нам не патрэбна вайна. Нам патрэбен мір для соцыялістычнага будаўніцтва, для ажыцьцяўленьня плянаў індустрыялізацыі краіны, для паляпшэньня становішча рабочых і сялян.

Усё-ж, ня глядзячы на нашу мірную політыку, на нас могуць напасьці. У нас паспрабуюць адняць кастрычнікавыя заваёвы. Для таго, каб абараняцца, неабходна ўзмацніць загадзя абароназдольнасьць Савецкага Саюзу. Многае ў гэтых адносінах рабілася і робіцца нашым урадам. Але перажываемы намі момант патрабуе яшчэ больных патуг, яшчэ большай напружанасьці ўсіх сіл краіны па ўзмацненьню яе абароны.

Зараз, як ніколі, павінна быць выключная ўвага Чырвонай арміі да пытаньняў абароны нашага Савецкага Саюзу.

Чырвоная армія да абароны краіны падрыхтавана. Але падрыхтаванасьці Чырвоная армія яшчэ недастаткова для справы абароны нашай соцыялістычнай бацькаўшчыны. Справа абароны зьяўляецца кроўнай справай кожнага рабочага і кожнай работніцы, кожнага селяніна і сялянкі. Мы маем у гэтых адносінах вялізныя магчымасьці. Адной з такіх магчымасьцяй зьяўляецца праца грамадзкай організацыі ТСААвіяхіму (Саюз таварыстваў прыхільнікаў абароны і авіацыйна-хэмічнага будаўніцтва СССР).

ТСАавіахэм.

ТСААвіхэм стварыўся з двух таварыстваў: ТСА (Таварыства Садзейнічаньня Абароны) і Авіяхэму (Таварыства прыхільнікаў авіацыйнай і хэмічнай прамысловасьці СССР). Перад аб'яднаным таварыствам стаяць вялікія задачы ў галіне ваеннага і мірнага будаўніцтва. Роля таварыства, яго праца ў сучасных умовах, набывае выключнае значэньне.

У сваім складзе таварыства мае два з лішнім мільёны чалавек. Таварыствам вядзецца і праароблена вялікая праца.

Ваенная падрыхтоўка працоўных

Вайсковую працу таварыства вядзе сярод рознастайнейшых катэгорый працоўнага насельніцтва. Работа вядзецца рознымі мэтадамі: скарыстаньне літаратуры, організацыя гурткоў вайсковых ведаў, індывідуальная і колектыўная прапрацоўка асобных пытаньняў, даклады, лекцыі, організацыя спэцыяльных ваенных курсаў, удзел у занятках вайсковых часьцей і манэўрах, пабудова ваенных куткоў, ваенныя выстаўкі, стралковыя спаборніцтвы і г д.

Студэнты ВНУ і вучні школ 2-й ступені, як будучы начсклад мабілізаванай арміі, павінны чотка ведаць задачы абароны Саюзу, прывіваць сабе першапачатковыя вавыкі ваеннай справы.

Стралковая падрыхтоўка.

У галіне стралковай падрыхтоўкі ТСААвіахэм ставіць сваёй задачай: ліквідаваць сярод сяброў ТСААвіахэму стралковую няпісьменнасьць, падрыхтаваць з іх меткіх, сьвядомых стралкоў і інструктароў, унядрыць стралковы спорт у масы працоўнага насельніцтва.

Дапамога хэмічнаму будаўніцтву.

Вырашаецца вялікая задача—аказаньне найбольшага садзейнічаньня разьвіцьцю хэмічнай прамысловасьці. Закончаны прапрацоўкай пытаньні хлору, брому, ёду і серы. Садзейнічаньне выкананьню гэтай задачы ўзяў на сябе ТСААвіахэм. Асноўным у рабоце па організацыі паветранай хэмічнай абароны зьяўляецца разгортваньне сярод шырокіх мас насельніцтва авіахэмічных ведаў і абучэньне іх працівагазавай справе. Дабіцца таго, каб кожны рабочы : работніца, кожны селянін і сялянка ўмелі абыходзіцца з працівагазам,--вось задача, пастаўленая таварыствам. У мэтах выкананьня яе організавана сетка авіахэмкаманд на прадпрыемствах. Ня глядзячы на тое, што гэта праца толькі нядаўна пачата, таварыства ўжо мае каля 200 каманд, праз якія прапушчана звыш 6000 чалавек.

Дапамога авіацыйнаму будаўніцтву

Дакастрычнікавая Расія зусім ня мела сваёй авіацыйнай прамысловасьці і стварала авіацыю выключна за лік замежных паставак. Атрымаўшы надзвычайна небагатую спадчыну, Савецкі ўрад ледзь мог управіцца з складаным рамонтам авіацыйнай маемасьці, якая прышла ў няпрыгоднасьць у процэсе грамадзянскай вайны. Грамадзкасьць у асобе ТДПФ, затым авіахэму, затым ТСААвіахэму—сыграла вялікую ролю ў справе садзейнічаньня разьвіцьцю авіацыйнай прамысловасьці. У выніку вялікай працы мы бачым тыя блiскучыя пералёты савецкіх самалётаў у працягу апошніх двух год.

Чарговыя задачы

Чарговымі задачамі зьяўляюцца: далейшае ўцягваньне ў ТСААвіахэм новых членаў, організацыя збору сродкаў у спэцыяльны фонд «Наш адказ Чэмбэрлену», упарадкаваньне ў прыёму сяброўскіх узносаў, зліквідаваньне запазычанасьці па ім, ахоп усіх сяброў таварыства практычнай працай.

З узмацнёнай энэргіяй мы павінны ўзяцца за іх вырашэньне. У адказ на ўсе інтрыгі, на ўсе правакацыйныя ўчынкі і пагрозы па адрасу нашай соцыялістычнай дзяржавы, мы адкажам яшчэ большай згуртаванасьцю і ўзмацненьнем абароназдольнасьці Савецкага саюзу.



Лёзунгі да кампаніі „Наш адказ Чэмбэрлену“ і „Тыдню абароны“

У барацьбе за мір, узмацняйце абарону Савецкага Саюзу!

Міжнародны імпэрыялізм і міравая рэакцыя будуюць новыя подступы супроць Савецкага Саюзу. Пролетары і сяляне, будзьце дбайнымі!

Узмацнім тэхнічную базу савецкае абароны, створым фонд „Наш адказ Чэмбэрлену“!

Комсамолец, сябра ТСААвіахіму, больш актыўнасьці ў працы па будаўніцтву абароны, авіацыйнай і хэмічнай прамысловасьці!

Марскія мяжы СССР пад пагрозай... Узмацняй абарону берагоў!

Вораг робіць замах на нашае соцыялістычнае будаўніцтва... ТСААвіахім—вартаўнік на ахове мірнай працы. Ячэйкі ТСААвіахіму! Станавіцеся на варту!

Комсамольцы, садзейнічаючы ТСААвіахіму, вы ўзмацняеце абарону Савецкага Саюзу!

Рабочая і сялянская моладзь! Абкружым няпрыступнай сьцяной цьвярдыні соцыялістычнага будаўніцтва, умножым шэрагі ТСААвіахіму!

Комсамольцы, узмацняйце моц і сувязь з рабоча-сялянскай Чырвонай арміяй!

Больш увагі рабоце з дапрызыўнікамі і пераменьнікамі!

Стралковыя гурткі, гуртні вайсковых ведаў, авіацыйна-хэмічныя каманды, спар[illegible]ныя гурткі, за працу!

Узмацнім сваю ваенну[ю] вучку! Кожны комсамолец [па]вінен ўмець уладаць зб[роя]й. Кожны комсамолец па[вінен] прайсьці ваенную падрыхто[ў]ку. Кожная комсамолка павін[на] атрымаць вайсковыя навы[к]і і ведаць ваенна-санітарную справу.

Комсамольцы, знаходзячыеся ў шэрагах Чырвонай Арміі!

Ленінскі Комсамол зорка сочыць за вашай працай і зучобай. Вы павінны даваць прыклад цьвёрдасьці і дысцыпліны. Вы павінны быць прыкладнымі салдатамі рэволюцыі. Вы павінны цьвёрда стаяць на сваім пасту.

Некалькі парад стралковаму гуртку

Стралковы спорт--справа, захапляючая і лёгка даступная. Таму наша моладзь з ахвотай ідзе «пастраляць». Гэтым артыкулам мы хочам дапамагчы вясковай ячэйцы ТСААвіахіму наладзіць гэтую карысную і цікавую справу.

Стралковы спорт можна падзяліць на тры ступені.

Першая ступень-- падрыхтоўка меткага стралка. Ад стралка першай ступені патрабуюцца веды асноўнай балістыкі (навукі, якая займаецца досьледам руху снарадаў), матар'яльнай часткі аружжа, уменьне рабіць меткі выстрал на розныя адлегласьці з розных становішчаў (стоячы, з калена, лежачы).

Другая ступень--падрыхтоўка страл ка-байца. Меткі стралок павінен умець прыстасоўваць свае здольнасьці да абставінаў, блізкіх к баявым дзейнасьцям. Для гэтай мэты стралковым гурткам у летні час трэба праводзіць індывідуальныя, колектыўныя стрэльбішчы ў полі. Стралок--баец павінен уладаць уменьнем выбіраць мэту, улічваючы асаблівасьці мясцовасьці. і г. д.

Трэцяя ступень--выпрацоўка стралка--снайпінга (стралка, уладаючага надзвычайнай меткасьцю).

Програмы для стралковых гурткоў

Ячэйкі ТСААвіахіму скардзяцца на адсутнасьць програм для стралковых гурткоў; такая програма яшчэ толькі распрацоўваецца цэнтральным саветам ТСААвіахіму. А покуль трэба карыстацца кніжкай т. **Булыгіна**, якая дае зусім дастатковыя паказаньні для падрыхтоўкі стралкоў у абыйме першай ступені. Акрамя гэтай ёсьць яшчэ кніжкі па стралковаму спорту т. т. **Сьмірнскага і Алкалаева**.

Для стралкоў другой ступені програмы покуль могуць складацца самымі ячэйкамі ТСАавіахіму. Для складаньня гэтых програм трэба прыцягнуць камандзіраў мясцовых вайсковых часьцей.

Дзяшовае дробнакаліберпае аружжа

Асноўнай умовай пасьпешнага разьвіцьця стралковай справы ў вёсцы зьяўляецца наліччa аружжа і ціраў для стральбы.

Маючыяся ў прадажы дробнакалі[берныя] вінтоўкі каштуюць ад 40 да [illegible] рублёў за штуку. Для маламоцных яч[эек] такая цана не пад сілу. Але і па гэтай цане вінтоўку ня ўсюды зараз [illegible].

Зараз ужо вынайдзены дробна-каліберныя вінтоўкі, якія будуць каштаваць ад 20 да 27 рублёў. Аднак, у продаж яны выйдуць яшчэ ня так скора.

Покуль-жа трэба ўсялякім чынам выкарыстоўваць магчымасьць атрыманьня вучотных вінтовак з мясцовых воінскіх частак. Трэба мець на ўвазе і магчымасьць карыстаньня аружжам **мясцовых органаў міліцыі і атрадаў чыгуначнай варты.**

Дзе шукаць інструктароў?

Што датычыць інструктароў для вядзеньня занядкаў у стралковых гуртк[ах, то] дык першае, вядома, што можна [параіць,] гэта зьвярнуцца да камандзіраў мясцов[ых] воінскіх частак, якія могуць выл[учыць] у якасьці інструктароў, асоб ко[мскладу].

Для штодзённага-ж кіраўніцтва працаю стралковых гурткоў трэба [illegible] выкарыстаць прыцягненьне комскладу запасу, а то і вопытных чырвонаармейцаў--адпускнікоў.

Самадзейнасьць—галоўнае!

Мясцовыя акруговыя організацыі ТСААвіахэму заўсёды дадуць паказаньні як абсталяваць ціры і кароткія стрэльбішчы. Для іх пабудовы і наогул [illegible] трэб стралковых гурткоў, **магч[ы]**[illegible] дуць адпушчацца грашовыя сродк[і].

Але з тэй прычыны, што раз[мер] сродкаў будзе абмежаваны, ячэйкам ТСААвіахэму трэба самім праявіць актыўнасьць у вышуканьні сродкаў у сябе.

Праяўленьне самадзейнасьці і [ак]тыўнасьці неабходна ня толькі [ў] вышуку сродкаў, але і ўва ўсёй працы па стралковаму спорту. Толькі пры наліччы гэтых якасьцяй у саміх гурткоўцаў стралковы спорт зможа разьвівацца і даць савецкай краіне досыць добра абучаных стралкоў.

М. [illegible]

Дыскусыйны аддзел

Комсамолец ў сям'і

ЗЬВЕРСКІЯ АДНОСІНЫ САЎЧЭНКІ ДА СВАЕЙ СЯСТРЫ.—СВАЁ ЛОДАРНІЦТВА КОМСАМОЛЬЦЫ АПРАЎДВАЮЦЬ „ВЫКАНАНЬНЕМ КОМСАМОЛЬСКІХ АБАВЯЗКАЎ“.—КОМСАМОЛЬЦЫ—ВУЧНІ І СЛУЖАЧЫЯ ЛЕПШ ЖЫВУЦЬ З БАЦЬКАМІ, ЧЫМ РАБОЧЫЯ.—НАРАДА БАЦЬКОЎ НЕАБХОДНА.

Дыскусыя працягваецца.

Вінаваты і комсамольцы і бацькі

(Ячэйкі ЛКСМБ ст. Менск, Зах. чыг.)

У Менскім вузьле ёсьць чатыры комсамольскія ячэйкі, у якіх налічваецца каля 280 комсамольцаў. Многія з іх жывуць самастойна, але ня мала ёсьць і пры сваіх бацьках.

Калі паглядзець на ўзаемаадносіны сыноў і дачок комсамольцаў з сваімі бацькамі, то справа стаіць ня зусім добра.

Сярод комсамольцаў, працуючых на вытворчасьці, беспрацоўных і вучняў наглядаецца шэраг момантаў няўжывучасьці з сваімі бацькамі.

Праўда, часамі бываюць выпадкі, што гэткае становішча выклікаецца паводзінамі саміх бацькоў.

Калі сын іх працуе, то ён добры тады, калі ўвесь свой заробак аддае пад кантроль бацькоў. Гэта справа, здавалася-б, і надта добрая—меньш хлапцу клапот, у некаторых адносінах экономія сродкаў і гэты вопыт для самастойнага жыцьця. Але далёка ня так. Ёсьць шэраг выпадкаў, калі заробак то аддай, але шыш атрымаеш у патрэбны табе момант:

— «Што за твае грошы зробіш, гэтага чуць толькі на харчаваньне хапае» —адказваюць бацькі. Вось з гэтага ў большасьці і пачынаецца так званая «буза». Як бы сабе ня было, але і хлопцу трэба адзецца і ў кіно або ў тэатр калі-небудзь заглянуць.

Характэрны прыклад з комсамольцам Кутаём: калі знасіў гарнітур і бацінкі і папрасіў у бацькоў грошай на іх набыцьце, яны яму ня далі. З гэтага-ж моманту яны жывуць паасобку і палаяўшыся.

Але калі хлапец беспрацоўны, дык тут справа зусім дрэнна: штодзённая лаянка як з боку бацькоў, так і з боку комсамольцаў. Бацькі зводзяць да аднаго: —**лодар, вон, няхай корміць Комсамол.** Такі выпадак быў з т. Абакуном.

Ва ўсём гэтым трэба вініць бацькоў.

Цяпер паглядзім, як стаіць справа з нашай адзыўчывасьцю на голас бацькоў.

Нельга сказаць што добра. Але тут наглядаецца зусім другое зьявішча.

Хлапец, атрымаўшы адпаведную кваліфікацыю і зарабляючы ў сярэднім каля 80 рублёў, пачынае думаць аб нечым вялікім, у яго паяўляецца гонар і ўяўленьне самастойнасьці.

Вазьму прыклад з комсамольцам Некрашам. Хлапец пачаў атрымоўваць пэнсію да 80 рублёў. Пачуўшы моц, ён зараз жа ажаніўся, пасьля чаго пакінуў матку і брата-вучня і пашоў жыць самастойна, не пасылаючы ім ні капейкі.

Вось тут і паяўляецца з боку бацькоў абіда. Трэба прызнацца, што тут ужо віна комсамольцаў, як у першых двух выпадках—бацькоў.

Такіх зьявішчаў у нашых чыгуначных ячэйках можна знайсьці многа.

Мне здаецца, што тут вінаваты і комсамольцы і бацькі.

У першым выпадку бацькам трэба быць адзыўчывымі ў адносінах да сваіх сыноў і дачок-комсамольцаў. У другім—комсамольцам ня трэба забываць сваіх бацькоў і чым магчыма дапамагаць ім.

Гэта зьнішчыць розныя маючыся непаразуменьні і значна палепшыць узаемаадносіны комсамольцаў з бацькамі.

Ведаючы.

Сям'я і комсамольцы—вучні, служачыя і рабочыя

Пытаньнем аб жыцьці комсамольцаў у сям'і Менская комсамолія да гэтага часу чамусьці не цікавілася. Здаецца ні ў адной ячэйцы гэтая тэма, тэма надзвычайна цікавая і балючая, не разглядалася на сходах, не абгаварвалася комсамольцамі.

Казаць агулам, што большая частка комсамольцаў з бацькамі жыве добра, як гэта кажа тав. Янка,--апасна, бо статыстыка тутка адсутнічае.

Па маім нагляданьням комсамольцы—вучні і служачыя жывуць з бацькамі лепш, чым комсамольцы—рабочыя.

Вазьму, напрыклад, ячэйку агульна-адукацыйных курсаў, з 45 комсамольцаў толькі 5-6 чал. працуюць і зарабляюць грошы на пражытак, астатнія жывуць выключна на сродкі бацькоў (ніякай стыпендыі ў нас не даюць). Адгэтуль вывад,—калі-б комсамольцы з бацькамі жылі дрэнна, дык апошнія, бязумоўна, не аказвалі-б ім ніякай дапамогі.

Нашы комсамольцы-сяляне, прыяжджаючы дамоў, дапамагаюць бацькам у рабоце, але, як гэта выявілася на адным з апошніх сходаў ячэйкі, яны новых форм і мэтадаў сельска-гаспадарчай працы ім не паказваюць. Гэта ўжо дрэнна.

Ёсьць шмат комсамольцаў, якія матэрыяльна дапамагаюць бацькам; але іншыя злоўжываюць сваім становішчам гаспадара, як, напрыклад:

— **Кожны дзень прыходзяць да дому а 1-2-ой гадзіне ночы, а бацьку ці матцы прыходзіцца сядзець і чакаць,**

— **Хлапец грошай сям'і дае мала, а больш траціць на тэатр. кіно, концэрты і г. д., або комсамолка зробіць сабе шмат блузак, спадніц, некалькі пар бацінак, у той час, калі маці, якая знаходзіцца на яе ўтрыманьні, ходзіць у парваных башмаках, абарваная і г. д.**

Такія моманты параджаюць у бацькоў варожасьць да сваіх дзяцей-комсамольцаў. Прама яны комсамольцу аб гэтым не кажуць, бо баяцца лішэньня атрымліваемай дапамогі, а вось калі прыходзяць знаёмыя, дык яны ім ізьліваюць усё, што накіпела на сэрцы і кажуць: **„Трэба маўчаць, казаць, што ўсё добра, бо і гэта прападзе“.**

Бязумоўна, гэта такія зьявішчы, якія патрабуюць зьнішчэньня.

Іншы раз бываюць лаянкі на рэлігійнай глебе. **У яўрэйскія коляды есьці хлеб ня можна. Комсамолец наўмысьня купляе хлеб, прыходзіць да дому і кладзе яго на стол, у пэйсаховы шкаф і г. д.** Рэлігійныя бацькі лаюць і сварацца, а комсамолец кажа, што ён гэтым праводзіць антырэлігійную работу.

Бываюць і адваротныя выпадкі, калі хлапец ужо цягнецца ў хвасьце, напрыклад:

-- Бацька, заўважыўшы які-небудзь адмоўны бок у дзяржаўным апараце, пачынае лаяць уладу, партыю і г. д., а комсамолец, які павінен яму растлумачыць сутнасьць справы, гэтага ня робіць.

Я далучаюся да прапаноў тав. Янкі, але дадаю, што рэдакцыя «Чырвонай Зьмены» павінна зрабіць пачын--склікаць сход па пытаньням «Комсамолец і сям'я». **Гэтую-ж тэму ячэйкам неабходна прапрацаваць на сваіх бліжэйшых сходах і заслухваць справаздачы комсамольцаў аб іх жыцьці ў сям'і.**

Як. Шур.

Зьверства Саўчэнкі

(Філатаўская ячэйка ЛКСМБ, Талачынскага раёну)

Комсамолец Саўчэнка--самастойны гаспадар; у яго няма ні бацькі, ні маткі,--жыве ён з сястрою.

Як-жа яны жывуць?

-- Надта „прыкладна“. Часта Саўчэнка так...ізьбівае сваю сястру, што аж... кроў паказваецца- даючы, гэтым самым адчуваць ёй, што ён,--комсамолец--самастойны гаспадар!

Аб гэтым ведаюць сяляне ўсёй вёскі—надарма-ж яны на яго заўсёды скардзяцца: „Вось чым займаецца ваш комсамолец!“

Ведае аб гэтым і комсамольская ячэйка. Саўчэнку ўжо далі выгавар, але і гэта не памагае.

Што-ж далей?

Ячэйцы трэба прыняць самыя суровыя меры, каб палажыць канец зьверству Саўчэнкі.

Над ім павінен быць зроблен паказальны суд.

Міхась Зак.

СПРАВЫ І ДНІ ЗАДУБСКАЙ ЯЧЭЙКІ

Задубская ячэйка ЛКСМБ, Кармянскага раёну, Магілеўскай акругі, прэміраваная на акруговым конкурсе вясковых ячэек першай прэміяй, здолела практычна знайсьці спосабы ўвязкі асабістай зацікаўленасьці комсамольцаў у палепшаньні сваёй гаспадаркі з агульнымі задачамі соцыялістычнага будаўніцтва. Каб даць організацыі і ячэйкам нашага саюзу малюнак, як практычна можна вырашаць гэту цяжкую задачу дню, рэдакцыя «Чырвонай Зьмены» зрабіла агляд працы прэміраванай ячэйкі. Друкуемы матар'ял агляду павінен зьявіцца ўзорам—як трэба працаваць комсамольскім ячэйкам у вёсцы.

Гаспадарку на новы лад.

Гісторыя Задубскай ячэйкі ЛКСМБ—вельмі падобна на гісторыі амаль усіх нашых ячэек: больш актыўная моладзь організавалася спачатку ў гурток, нават не даючы сабе ўяўленьня ў мэтах і задачах яго. Потым прыехалі з Кармы комсамольскія організатары. зацікавіліся Задубскім гуртком моладзі, расказалі аб комсамоле, яго задачах і **гурток пераіменаваўся ў комсамольскую ячэйку.** Гэта было ў 1923 годзе.

Але для Задубскай ячэйкі, для ўяўленьня хоць у самых сьцісных рысах яе твару важна ня гісторыя, **а ўмовы, у якіх працякае ўся праца.**

... Задуб'е—бедная вёска. І не таму бедная, што ня мае выгад для разгарненьня сельскай гаспадаркі. Наадварот, задубская зямля—з лепшых глебаў у Беларусі, сенажаці таксама ня з горшага гатунку, ды і пашы для жывёлы хапае.

Беднасьць Задуб'я--у цемнаце, няпісьменнасьці, някультурнасьці, у вялізарнай аддегласьці ад культурных асяродкаў: да Магілева больш 100 вёрст, у Рагачоў--45, Карма і тая адцягнулася вёрст за 15. Большая частка насельніцтва ня мае ўяўленьня аб чыгунцы, аб цягніку, што «бяжыць без каня і так хутка», аб вуліцах і камяніцах гораду, асьветленых электрыкай, аб тэлефоне, радыё...

Таму і вуліца вёскі такая няпрыгожая, крывая, таму і будынак пакрыўленыя, пагніўшы, з пазадзіранымі ветрам стрэхамі. А ў хаце нават самага багатага гаспадара яшчэ няма добрага стала, а проста дошкі зьбітыя і падпёртыя чатырмя ножкамі, яшчэ няма ложкаў, а пасьцельнае лахманьнё звалена на замурзаныя плашчакі полу, пад якім выкапана глыбокая яма для бульбы.

А ўсё-ж гледзячы на вёскі Задубскага сельсавету, унікнуўшы ў працу комсамольскай ячэйкі--трох дзесяткаў лепшай сялянскай моладзі--напаўняешся перакананьнем:

— **Як многа ёю зроблена, як многаму тут навучыцца можна!**

„Дзед Задуб'я не пазнаў-бы“

Зацуглялі сваю энэргію

Бюро прапанавала ўсім комсамольцам прачытаць, хто колькі зможа, навейшую літаратуру па сельскай гаспадарцы, што «заваліялася» у комсамольска-сельсавецкай бібліотэчцы. А праз тыдзень, вясной 1925 года, на агульным адчыненым сходзе ячэйкі **Кузьма Купрэеў**, вопытнік пасёлку **Ільліч, „аграном-самародак“**, як завуць яго сяляне, робіць даклад на тэму: **„Тое што павінен зрабіць кожны комсамолец у сваёй гаспадарцы“.**

Такое пытаньне зьдзівіла частку комсамольцаў:—**А куды-ж мы дзенем свае рэволюцыйныя традыцыі і што з нас атрымаецца, калі возьмемся капацца ў бацькаўскіх гаспадарках.**

Ня гледзячы на гіранічныя супярэчаньні часткі старэйшых комсамольцаў, ячэйка прыняла пастанову, якая зрабіла цэлую рэволюцыю у жыцьці задубцаў. Зьмест яе кароткі:

— **Комсамольцы ў абавязковым парадку павінны сеяць насеньнем ачышчаным на сартыровачнай машыне, або на добрай варсе. Прапануецца сваё дрэннае насеньне абмяняць у саўхозе на гатунковае, аб чым бюро павінна дагаварыцца з загадчыкам саўхозу. Карняплоды. канюшына, лён—расьліны, якіх у нашай вёсцы няма. Давайце заводзіць іх у сваіх гаспадарках.**

Узяліся за выконваньне пастановы.

А прышла восень—**праверка выконваньню, падвядзеньне вынікаў.**

І выявілася.

Купрэеў Міхаль, бацька сэкратара ячэйкі, ніколі ня сеяў канюшыны. Ня сеяла яе і ўся вёска. І толькі пасьля памянёнай «нерэволюцыйнай» пастановы, Міхаль і яшчэ 7 гаспадароў паехалі ў Карму, купілі па фунты тры канюшыны, прапыталі там як і дзе яе лепш сеяць, у адзін ціхі дзень мужчыны хадзілі па пасеву ячменю, бралі з капялкоў у тры пальцы зярняткі-макавінкі і няўпэўнена кідалі іх у ральлю.

... **Налета Міхаль накасіў 100 пудоў канюшыны, а з маленькага кавалачку, пакінутага на насеньне, намалаціў тры пуды яго, якое, пакінуўшы сабе патрэбную вагу для пасеву, прадаў і атрымаў 42 рублі.**

Так зрабілі ў Задубскім сельсавеце 8 „акомсамоленых“ гаспадарак: дзьве Купрэевых, Кільчэўскія, Міхальковы, Філіпенкі і інш.

Першы блін ня вышаў комам.

Бачачы гэта, ячэйка стала практыкаваць пастаноўку дакладаў аб паляпшэньні комсамольцамі гаспадарак перад кожным сэзонам працы. Напрыклад, вясною аб правільнай сяўбе, улетку—аб даглядзе пасеваў, увосень—аб уцяпленьні хлявоў, правільным кармленьні жывёлы, ворыве назіму і г. д.

Таксама яшчэ асобным комсамольцам, асабліва самастойным гаспадарам, даваліся спэцыяльныя заданьні У выніку—**земляўпарадкаваньне ў дзьвёх вёсках' пераход на шматпольле пасёлкаў, у 10 гаспадарках—канюшына і карняплоды. 12 гаспадарак уцяплілі хлявы, зрабілі дацкія кармушкі.**

За што сяляне зрабілі атаку на ячэйку?

У мінулым годзе 7 комсамольскіх гаспадарак пасеялі гэтыя самыя кармавыя буракі. **Удаліся вельмі добрымі. З маленькіх кавалачкаў накапалі пудоў па 60.**

Прышла вясна. Амаль што ва ўсіх скупа на харч. Калі комсамольцы «карняплодзіны» дасталі з капцоў буракі, а іх каровы, кормячыся карняплодамі, пачалі прыбаўляць малака, **задубцы зараз-жа сабраліся ў ячэйку, склалі сьпіс на патрэбу ў насеньні карняплодаў і паслалі двух хлапцоў-комсамольцаў у Магілеў за пакупкамі.**

Прывезенае насеньне падзялілі у тойжа дзень. Прачулі суседнія вёскі і сяляне цэлымі дзесяткамі прыходзілі у ячэйку.

— Цэлыя атакі былі,--кажуць хлопцы.

Як не старалася ячэйка, а задаволіць жаданьні сялян так і неўдалося: у Карме карняплодаў ня было, а паслаць спэцыяльна ў Магілеў чалавека нявыпала.

„Падманілі Рык“

Раней пытаньне аб правядзеньні ў Задуб'і сельска-гаспадарчых курсаў абгаварыў па прапанове ячэйкі прэзыдыум сельсавету. Потым пераслалі хадайніцтва у РВК і кожны дзень то лістам, то хто будзе, так зойдзе, надакучалі у Зямельны аддзел аб прысылцы у Задуб'е двух агрономаў.

Надаела, мабыць, РВК «тузацца» з задубскімі комсамольцамі, узяў і накіраваў ім двух агрономаў.

Радавалася моладзь і сяляне, што ўдалося, як яны кажуць, «падманіць рык».

Курсы працавалі два тыдні. Займалася на іх 30 чалавек. Большасьць--моладзь. За гэты час агрономы **пазнаёміліся з комсамольскімі гаспадаркамі і кожнай далі практычныя паказаньні, а комсамольцам - пасялкоўцам склалі нават васьміпалёвыя пляны і кожнаму раздалі.**

Кожнае пачынаньне ячэйкі у справе паляпшэньня гаспадаркі вельмі ўдаецца. Гэта штурхае ўсіх вяскоўцаў да культурнасьці ў гаспадараньні. А селянін Кільчэўскі, на ўрачыстасьці юбілею ячэйкі проста вітаў комсамольцаў:

— **Каб прачнуліся нашы бацькі, а вашы дзяды, дык і не пазналі-б сваіх ніў: гэта-ж толькі вы ўсякай усячыны панавыдумвалі.**

Зьм. Паваротны.

Зьніжэньне цэн і кантроль мас.

Артыкул намесьніка Наркому РСІ тав. Віленстовіча для „Чырвонай Зьмены“)

Апошні пленум ЦК КП(б)Б, які падвёў папярэднія вынікі зьніжэньня розьнічных цэн на прамтавары, адзначыў, што дырэктыва аб зьніжэньні розьнічных цэн на 10 проц. да 1-га чэрвеня г. г. на асноўную групу тавараў **выканана здавальняюча.** Але побач з гэтым пленум прызнаў **шэраг недахопаў** у працы па зьніжэньню цэн.

Асноўным недахопам зьяўляецца тое, што зьніжэньне цэн праведзена за кошт накапленьняў, за кошт прыяданьня асноўных капіталаў, а не за кошт рацыяналізацыі дзейнасьці нашых гандлёвых установ. Значная частка дзяржаўных, коопэрацыйных установ і прадпрыемстваў, **дырэктыву аб скарачэньні адміністрацыйных і гаспадарчых выдаткаў на 15 процантаў ня выканалі.** Устаноўлена, што нізавыя коопэратывы, асабліва сельска-гаспадарчыя не па ўсім таварам праводзяць абмяжаваныя надбаўкі, вызначаныя Наркамгандлем. Былі выпадкі, калі політыка зьніжэньня цэн зусім скрыўлялася, рабілася па вялічыне надбавак і цэн на ненармаваныя тавары, часам зьніжэньне цэн нават **адбівалася на якасьці тавараў.**

Павялічыць кантроль мас

Гэта магло быць таму, што **слаба адчуваўся кантроль над правядзеньнем зьніжэньня цэн з боку шырокіх рабочых мас.** Трэба дадаць, што не даволі рашуча адчуваўся ўдзел і кантроль па зьніжэньню цэн з **боку КСМ, з боку організаванай працоўнай моладзі, асабліва ў вёсцы.**

Мы ні ў якім разе ня можам прызнаць нармальным, калі зьніжэньне цэн адбіваецца на якасьці тавараў. Наадварот, **паляпшэньне якасці тавараў** ёсьць важнейшая задача рабочай клясы і працоўнага сялянства. **Паляпшэньне якасьці тавараў і зьніжэньне цэн**—гэта дзьве задачы, дапаўняючыя адна другую.

Пастанова пленуму па гэтату пытаньню кажа, што **ўдзел і кантроль шырокіх мас над правядзеньнем зьніжэньня цэн павінен быць павялічан.**

Гэта павінны больш чым хто іншы падхапіць комсамольскія масы, даказаць на прыкладзе, **што комсамол зьяўляецца лепшым праваднікам партыйных пастаноў**

Абагульняйце вопыт.

Неабходна адзначыць, што сябры КСМ **зусім мала пішуць, мала высьвятляюць вынікі зьніжэньня цэн на старонках свайго цэнтральнага органа, газэты «Чырвоная Зьмена».** А гэта было-б надзвычайна важна. Я спэцыяльна прагледзеў шэраг нумароў «Чырвонай Зьмены» за апошнія два месяцы і проста дзівіўся, што няма на старонках газэты асьвятленьня таго, што зрабіла тая ці іншая ячэйка па зьніжэньню цэн, якія абгаварваліся ў ячэйцы пытаньні. А перанясеньне **вопыту працы ў гэтай галіне ад адных ячэек на другія было-б надта важна і каштоўна, асабліва для вясковага комсамолу.**

У што ўпіраецца далейшае зьніжэньне цэн.

Далейшае зьніжэньне цэн ўпіраецца ў **памяншэньне сабекошту прадукцыі, у падняцьце вытворчасьці працы, у паляпшэньні якасьці прадукцыі і ў рацыяналізацыю вытворчасьці.** Адсюль відаць, што работа і кампанія па зьніжэньню цэн ня толькі не канчаецца, а пераходзіць у **вышэйшую сваю фазу.** Можна сьмела сказаць, што сучасны тэрмін зьніжэньня цэн на прамтавары, калі зьніжэньне ў значнай частцы праходзіла за кошт скарачэньня лішніх штатаў, лішніх камандыровак і зусім непатрэбных выдаткаў, гэтая праца была больш лёгкай.

І калі зараз мы маем здавальняючыя дасягненьні без занадта шырокага і актыўнага ўдзелу рабочых, сялян і комсамолу, а шляхам адміністрацыйных і організацыйных мерапрыемстваў, **то ў далейшым без актыўнага ўдзелу ў гэтай справе кожнага рабочага, працоўнага сялянства і ўсёй працоўнай моладзі, без усёй пролетарскай напружанасьці і разуменьня ўсёй складанасьці зьніжэньня цэн,—далейшыя посьпехі немагчымы.**

Усе комсамольцы **не на словах, а на справе павінны зьнішчаць прагулы, выконваць акуратна працу, быць лепшымі за лепшую вытворчасьць, дабіцца такой якасьці нашых тавараў і такога зьніжэньня цэн, якое патрэбна рэволюцыйнаму пролетарыяту і яго саюзьніку--працоўнаму сялянству.**

Саюзныя навіны

6-га ліпеня г.г. склікаецца пленум Магілеўскага АК ЛКСМБ. Пленум заслухае даклад бюро АК ЛКСМБ і даклад аб вайскова-шэфскай і фізкультурнай працы.

Пабудова Асінастрою

Саўнарком БССР зацьвердзіў палажэньне аб будаўніцтве Асінаўскай раённай электрастанцыі.

Паводле гэтага палажэньня, будаўніцтва Асінастрою знаходзіцца ў веданьні ВСНГ СССР. Непасрэдны нагляд за будаўніцтвам і кіраваньне ім ажыцьцяўляецца ВСНГ Беларусі, на падставе асобнай згоды з саюзным ВСНГ.

Начале будаўніцтва знаходзіцца галоўны інжынэр, які назначаецца прэзыдыўмам ВСНГ БССР і зацьвярджаецца на гэтай пасадзе Саўнаркомам Беларусі.

Галоўны інжынэр нясе поўную адказнасьць за работу будаўніцтва і кіруе ўсімі галінамі гэтай работы на падставе існуючых законаў і палажэньняў.

Скарыстаць багацьці зямлі

Да гэолёгічных дасьледваньняў па Беларусі

У БССР ёсьць шмат залежаў жалезнай руды, мінэралаў і г. д., якія магчыма было-б скарыстаць, але да гэтага часу глеба нашай краіны яшчэ недастаткова дасьледвана. Неабходна ўзмацніць геолёгічныя досьледы і аб'яднаць кіраўніцтва імі ў адным органе.

Саўнарком прызнаў неабходным утварэньне такога органу, які-б аб'яднаў гэолёгічна-дасьледчую работу ў БССР. Даручана Дзяржплану абмеркаваць пытаньне аб колькасьці і крыніцах асыгнаваньня сродкаў на геолёгічна-дасьледчыя работы ў бягучым годзе.

Барацьба з бяспрытульнасьцю

○ Менгарсавет зацьвердзіў пастанову таварыства „Прыхільнік дзяцей“ аб правядзеньні трохдзёньніку па барацьбе з бяспрытульнасьцю. Трохдзёньнік будзе праводзіцца па Менску 2-га, 3-га і 4-га ліпеня. У гэтыя дні наладжваюцца спэктаклі, організуюцца кружачныя зборы і адлічэньні на карысьць бяспрытульных дзяцей.

○ Дзеткамісія ЦВК БССР заключыла дагавор з адміністрацыяй цырка А. Г. Кіссо, згодна якога ў Менску з 1-га ліпеня пачынае сваю працу філія цырку, а таксама чэмпіонат па францускай барацьбе. Палова прыбытку з працы цырку будзе йсьці ў фонд барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

○ Гэтымі днямі Менскае таварыства „Прыхільнік дзяцей“ адчыняе ў Менску свой першы магазын, увесь прыбытак ад якога пойдзе на ўзмацненьне грашовага фонду таварыства. Шэраг такіх магазынаў адчыняецца і ў другіх гарадох Беларусі.

Няма „Чырвонай Зьмены“ у рабочых клюбах.—Ня менш 150 экзэмпляраў газэты пастанавілі выпісаць сьмілаўцы.

Ня меньш 150 экзэмпляраў на раён

(Сьмілавіцкі раён, Менскай акругі)

На нашым раёне па вестках пошты выпісваецца 15 экзэмпляраў газэты „Чырвоная Зьмена“, сюды уваходзіць выпіска і беспартыйнай моладзьдзю.

Райком комсамолу на пасяджэньні бюро абгаварыў гэтае пытаньне і пастанавіў правесьці у організацыі дзеля папулярызацыі „Чырвонай Зьмены“ і павялічэньня яе тыражу наступнае:

а) Устанавіць мінімальную выпіску ячэйкамі комсамола „Чырвонай Зьмены“ па раёну у ліку 150 экзэмпляраў, дзеля чаго напісаць таварыскі ліст ячэйкам.

б) На сходах ячэйкі паставіць пытаньне аб пяцітыднёвіку „Чырвонай Зьмены“.

в) Зьмяніць склад не працаздольных ячэйковых упаўнаважаных па распаўсюджваньню газэты.

г) ЯПА Райкому склікаць нараду ячэйковых упаўнаважаных разам з юнсэлькорамі, дзе паставіць пытаньне аб „Чырвонай Зьмене“, аб яе ўсямерным распаўсюджваньні.

М. Журавіна.

Згубіў адрасы...

Упаўнаважаны па друку камсамольскай ячэйкі заводу „Варшавянка“ згубіў адрасы комсамольцаў, падпісаўшыхся на газэты.

У выніку атрымалася тое, што газэты прыходзілі на адрэс Заўкому і хлапцы неакуратна атрымоўвалі выпісаныя газэты, у тым ліку і „Чырвоную Зьмену“.

Сход ячэек 2-х харчавых заводаў і заводу „Варшавянка“, пасьля дакладу аб „Чырвонай Зьмене рашыў:

— Умяніць у абавязак кожнага актывістага ячэяк выпісаць газэту „Чырвоная Зьмена“.

— Абвясьціць конкурс на распаўсюджваньне „Зьмены“ паміж абодвымі ячэйкамі.

Міх. Зак.

Моладзь чакае „ЗЬМЕНЫ“

Клюбы якія існуюць у Менску чамусьці пры выпісцы газэт для чытальні мысьляць што газэту **„Чырвоная Зьмена“** выпісваць ня трэба, ня лічачыся нават з тым што 40 проц. сяброў гэтага клюбу моладзь.

Клюбы **Гарбароў, Нархарч, Клюб Ільліча МББ, клюб Леніна, летні сад „Прафінтэрн“, клюб Зах. Чыгункі**—дзе моладзь зьяўляецца галоўнай часткай клюбу—газэты **„Чырвоная Зьмена“ ня выпісваюць.**

Моладзь чакае „Зьмены“.

Эд. Ш.

Бярэце прыклад

У зьвязку з пяцітыднёвікам „Чырвонай Зьмены“, агульны сход комсамольскай ячэйкі абойнай фабрыкі (Менск) заслухаў даклад рэдакцыі, пасьля якога прыняў наступную пастанову:

Усім членам ячэйкі выпісаць „Чырвоную Зьмену“ на месяц.

Такую-ж пастанову, з выпіскай газэты на тры месяцы, вынес агульны сход ячэйкі шавецкай майстэрні прычым выклікаў выпісаць „Чырвоную Зьмену“ на тры месяцы ўсіх комсамольцаў ячеек абуўнай фабрыкі і працколектыву шаўцоў.

Усім ячэйкам, якія яшчэ не падпісаліся на „Чырвоную Зьмену“, трэба пасьледваць прыкладу ячэек абуўнай фабрыкі і шавецкай майстэрні.

„Два“ на сцэне клюбу „КІМ“

(Пастаноўка яўрэйскага драмгуртку)

Некалькі месяцаў таму назад яўрэйскі драмгурток клюбу «**Кім**» выступаў перад юнацкай аўдыторыяй у п'есе Л. Кацовіча «**Ін ене тэг**». Добрая гульня артыстых, іх глыбокае пранікнавеньне ў вобразы п'есы, былі належным чынам ацэнены гледачамі і пакінулі ў іх моцнае ўражаньне.

Апошнімі днямі мы бачылі на сцэне клюбу другое выступленьне яўдрамгуртку, на гэты раз у пастаноўцы «**Цвэй**», створанай па вядомай аповесьці Анатоля Вольнага «**Два**». Здавалася-б, што члены драмгуртку ўжо аднойчы зарэкомэндаваўшы сябе, як здольныя аматары акажуцца і зараз на вышыні задачы.

Іменна гэтага і чакала моладзь, запоўніўшая сад «**Кім'у**» у вечары 26-га чэрвеня.

Чаму-ж гледачы, асабліва чытаўшыя апавяданьне Вольнага, у шмат якіх мясцох п'есы скэптычна ўхмыляліся і паціскалі плячыма? Чаму наогул кожны акт п'есы не спадарожваўся воплескамі, на якi, як вядома, наша моладзь ня скупая?

Адказу на гэтыя запытаньні трэба шукаць як у аб'ектыўных прычынах, незалежачых ад выканаўцаў—зьмесьце самой п'есы, гэтак і ў выкананьні роляў.

Пачнем з першага. Кожны, хто чытаў «Два» Вольнага, захапляўся прыгожасьцю, сакавітасьцю яго чыста беларускіх нацыянальных вобразаў і багацтвам мовы дзейнічаючых асоб, асабліва сялян паўстанцаў.

Пры перакладзе на яўрэйскую мову, усе гэтыя прыгожыя неперавадзімыя вобразы зьніклі. Калі дадаць сюды спэцыфічна-яўрэйскія жесты і міміку артыстых, дык стане зразумелым, чаму атрымалася пастаноўка хутчэй з яўрэйскага, чым з беларускага жыцьця.

Мы хочам сказаць, што перакласьці беларускі твор на яўрэйскую мову яшчэ ня значыць дапасаваць яго да сцэнічнай пастаноўкі на гэтай мове. У гэтым фактычна памылка рэжысёра.

Другім ня менш буйным недахопам пастаноўкі трэба лічыць штучную, нацягнутую гульню большасьці ўдзельнікаў. Яскрава адчувалася як цяжка яўрэйскім хлапцам граць п'есу з беларускага жыцьця і выконваць нязвычныя ролі.

Сцэна панскага балю ў першым акце, якая, відаць, па думцы рэжысёра, павінна была паказаць «распад і распусту паншчыны», утварыла зусім адваротнае уражаньне сваей карыкатурнасьцю і няжыцьцёвасьцю.

Хіба досыць апрануць намалёваных дзяўчат у кароткія да бёдраў рознакаляровая спадніцы, каб паказаць гніцьцё панскага ладу, перакавацць яго ў нятрываласьці гэтага ладу? Гэта адчувалі нават няіскушаныя у такіх сцэнах гледачы.

Выступленьне балетнага гуртку ў сярэдзіне п'есы карысталася посьпехам і крыху зьмягчыла прыкрасьць сцэны «панскага распаду».

Трэба яшчэ адзначыць непрыстасаванасьць сцэны да пастаноўкі «Двух», адсутнасьць па ходу дзеі масавага сялянскага паўстанцкага руху, недахоп дэкорацый і г. д.

Дзякуючы ўсяму вышэй сказанаму, гледачы замест гэроічнай эпопэі беларускіх паўстанцаў, убачылі нешта кулае і штучнае.

* * *

Некалькі слоў у заключэньне.

Па нашай думцы яўрэйскі драмгурток клюбу «КІМ» узяў неправідловы кірунак. Трэба адмовіцца ад фальшывага і штучнага асьвятленьня беларускага жыцьця, трэба даваць бытавыя, рэальныя пастаноўкі з жыцьця моладзі, пераважна яўрэйскай. Гэта патрабуе комсамольскі гляддач і гэта лепш зможа выканаць яўдрамгурток.

Я. Зэльцар.

На рыштаваньнях ля цэглы і цэмэнту

Будаўнічы сэзон па Беларусі ў самым распале

„Смаленскія плотнічкі“

На жаргоне будаўнікоў усіх рэспублік вядомы „смаленскія плотнічкі“—нізкарослыя, карэнастыя мужычкі-выхадцы Смаленскай губэрні. Гэта яны кожнае прадвесьне, быццам стаей гракоў налятаюць ва ўсе гарады Саюзу, каб атрымаць працу на пабудовах.

Менск у гэтым годзе адратаваны ад іх. Кожную раніцу ў 8 гадзін 500 добра кваліфікаваных рабочых пачынаюць напоўваць маладкамі па цэжкай, абліцованай, цэглянай сьцяне, ці замешваць шэрае цеста цэмэнту, ці пакрыкваюць: „Эй, стараніся!“ — нясучы пару дзесяткаў цэглы па бясконцым гнуткім драбінам.

„Смаленскія плотнічкі“—рэдкія госьці. Іх сустрэць магчыма толькі на якой-небудзь акраіннай пабудове — узьвядзеньню доміка з трыма сьлепаватымі вокнамі і парай цёмных закойчыкаў.

На цяперашніх менскіх пабудовах патрэбны рабочыя не „самародкі“, а значнай кваліфікацыі, вось чаму зараз тут так шмат моладзі-падросткаў скончыўшых профшколы будаўнікоў.

Менск будуецца

І вось, нарэшце, Менск адбудоўваецца! Пасьля прайшоўшага гурагану польскіх і нямецкіх окупацый, пасьля страшэнных вогнішчаў, калі вялізарныя будынкі, зруйнованыя з зямлёй, зьялі чорнымі вачыма дымячых астанкаў.

Нарэшце Менск у рыштаваньнях! Растуць новыя кварталы і вуліцы, каласальны 4-х-павярховы будынак Комбанку на гэту восень будзе стаяць на рагу вуліц Карла Маркса і Ленінскай.

На гэтай пабудове зараз занята 100 чалавек рабочых. К 1-му кастрычніку будынак будзе закончан ўчарне. Зробяць страху, часткова пакладуць паловіцы. І ў будучую вясну яго скончаць і аштукатураць. Зімою будуць зроблены рамы і дзьверы.

Як гавораць трэстаўцы з „Белдзяржстрою“, будынак будзе абарудаван па апошняму слову тэхнікі, у новым амэрыканізаваным стылю па калідорнай сыстэме з цэнтральным атапленьнем і вентыляцыяй.

Дом разьмяркован апроч памяшканьня Комбанку, яшчэ на 24 кватэры для супрацоўнікаў і ўвесь першы паверх будзе аддадзены пад магазыны.

Зараз ужо з літага, цэмэнтнага фундамэнту закончана сутарэньне і кладзецца першы паверх.

Новы скураны завод—гордасьць трэсту і гордасьць скураных рабочых. Ужо ня будзе тых цёмных клетчатак-пакойчыкаў, ня будзе ад заводу несьці пахам за некалькі вёрст.

У аграмадным, сьветлым памяшканьні, новыя амэрыканскія машыны, вэнтыляцыя, вялізарныя вокны.

Шмат сьвету. Усюды сонца... Калі ўваходзіш, бачыш радасныя, радасныя ўхмылкі скурнікоў. Стаяць і глядзяць ці хутка скончаць пабудову, абрыдла ў старым, гразным памяшканьні.

К восені завод будзе адбудован, апроч новага, двухпавярховага корпусу плошчы ў 600 квадратных сажняў, пабудавана яшчэ машыннае аддзяленьне, вадапорная вежа і прыбудовы да старога заводу. Усё гэта абыйдзецца ў 350 тысяч рублёў. Галоўны корпус вялікі, цяжка ўявіць сабе, што адзін паверх толькі 300 кв. сажняў. Лягчэй сказаць, што ў шырыню ён больш 20 мэтраў.

Заканчваюць пабудову 70 чалавек рабочых.

Тут-жа побач трэст будуе мэханічны цэх заводу „Энэргія“. Гэты невялічкі аднапавярховы корпус таксама ўвесь абрызганы сонечнымі праменьнямі ў вялікіх, сажонных вокнах. Даўжыня корпусу 52 мэтры, шырыня -23. Мэханічны цэх будзе закончан у гэтым годзе.

І вось яшчэ ў Ждановічах сярод мяккіх соснаў і ёлак вырасьце дагэтуль нявіданае трохпавярховае памяшканьне для дому адпачынку. Новы дом адпачынку—прыгожая, стыльная пабудова.

У ім будуць сканцэнтраваны сталовая, заля, чытальня, пакоі адпачынку і г. д. На будучую вясну новы трохпавярховы будынак прыме пад сваю страху менскіх працоўных.

У Бабруйску і Барысаве

У мільён рублёў абойдзецца пабудова бабруйскага лесаапрацоўчага камбінату. У ім будзе знаходзіцца ўся перапрацоўка дзерава, пачынаючы ад простага слупа і канчаючы нулявымі нумарамі танчэйшай фанэры для інкрустацыі.

Пабудовай кіруе спэцыяльна запрошаны нямецкі інжынэр.

Камбінат будзе пабудован у 2 з пал. гады.

Барысаўская „Бярэзіна“ перабудоўваецца. Праца на новых рэльсах. Трэба ўводзіць конвэеры. Новае памяшканьне разьмяркоўваецца гэтак, каб ніводнага руху, ніводнага кроку ня было лішняга.

Поўная рацыяналізацыя. Корпус будзе доўгі, доўгі аднапавярховы з бясконцымі стужкамі конвэераў.

„Котэджы“ на зьмену хатам

Плачуць домікі з гэраньню на вакенцах у сітцавых, ружовых заслонках, маленькія домікі, старыя—чорныя грыбкі, уросшыя ў зямлю побач з заводам „Дрэваапрацоўнік“.

Цесна заводу, домікі клінам увайшлі, ціхія, маўклівыя з імшэлымі стрэхамі і дрыжаць яны, калі міліцыянэр праходзіць па вуліцы.

Хутка разьнясуць іх, нацягнуць бельку за бэлькай з крыкам:

— Яшчэ раз! А ну, эй!

Вырасьце новы корпус, сьветлы, вялікі, пабягуць конвэеры, заявяць цыркуляркі.

Падстрайваюцца „Варшавянка“ і „Пролетары“.

Бежыкасаюцца на акраінах павыстрайваў сотні дамоў і рабочых пасёлкаў.

На зьмену старым дамам—трунам ідуць сьветленькія „котэджы“.

„Котэджы“ разьлічаны на 2 сям'і, домік, 2 хляўцы, агарод. Ува ўсіх чатырох сьценах „Котэджа“ вокны, сонца ў хаце ўвесь дзень, да як-та няпрыемна называць яго хатай, вельмі далекая розьніца паміж „хатай“ і „котэджам“.

Новы стыль і новая архітэктура

Увайшлі ў мінулае старыя размалёваныя будынкі з тысячамі завітушак і прыбіраньняў.

Кастрычнік увёў новыя формы, прастату, магутнасьць і своеасабліваю прыгожасьць.

Ніякіх прыбіраньняў:- асобныя выступы, вялікія вокны, усюды сонца. Дом Комбанку яскравейшы прыклад.

Архітэктарам кіруе толькі эканомія сродкаў і мэта. На гэтай падставе ствараецца новы „стыль“.

Ён сухі і суровы. Гэты новы стыль, складзены з дзесяткаў аб'ёмаў і плоскасьцяў.

Алесь Каліта.

Згублены:

○ Сяброўскі білет № 675 на імя Харытонава, выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

○ Сяброўскі білет № 38574 на імя Трапашко З., выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

Лічыць страціўшымі моц.

Суд

„Брацъ што можна, пакуль ня позна“

У хуткім часе Менскі акруговы суд прыступіць да разгляду адной цікавай бытавой справы—забойства з-за аліментаў.

20-ці гадовы хлапец з вёскі Дунаеўшчына Ігнась Зіновіч знаходзіўся ў блізкіх адносінах з сваёй аднасяльчанкай—батрачкай Галенай Бандарчук. Абяцанкамі ажаніцца, ён схіліў Галену да сумеснага жыцьця з ім.

Калі пасьля доўгатэрміновай сувязі батрачка зацяжарэла, Ігнась прапанаваў ёй зрабіць аборт, ад чаго яна рашуча адмовілася. Не падзейнічала на яе і гатоўнасьць Зіновіча даць грошы на вытварэньне аборту.

Але Ігнась, не на жарты напалоханы перспэктывай выплаты грошай на утрыманьне будучага дзіцяці, задумаў як небудзь адвязацца ад Галены.

Падгаварыў 18-гадовага хлапца Габрыловіча на забойства дзяўчыны і абяцаў яму добра заплаціць за „акуратнае выпаўненьне справы“. Сябры выпілі і такім чынам замацавалі злачынскую ўмову.

Ня гледзячы на рашэньне забіць Галену, Зіновіч працягваў спатыкацца з ёй і сьпяшаўся, як ён потым казаў на судовым сьледзтве,— „браць што можна, пакуль ня позна“. Адвачасова ён не разуверыў Галену ў сваім замеры ажаніцца на ёй.

Аднэй ноччу, перад самымі Галенінымі радамі, Зіновіч рашыў, што настаў зручны момант дзеля ажыцьцяўленьня задуманага. Пад прадлогам пагаварыць аб шлюбе, ён напрасіў Галену пайсьці з ім нагуляць і дабіўся згоды. У часе гуляньня, малойчык шаптаў Галене палкія словы. Аднэй рукой ён абнімаў яе стан, другой рабіў знакі схаванаму ў кустох Габрыловічу, які быў узброен абрэзам.

Яны параўняліся. У той момант, калі не падазраваючы нічога дрэннага, батрачка прытулялася цясьней да Ігнася, з-за кустоў раздалося некалькі стрэлаў.

Забойца страляў метка. Галена была біта напавал і, ня прыходзячы ў прытомнасьць, памерла. Зіновічу якому куля таксама параніла некалькі пальцаў, нахіліўся над ня целам, каб упэўніцца ў сьмерці сваёй былой каханкі. Пасьля гэтага цела апошняй было схавана сябрамі ў лесе..

Крымінальны вышук хутка выкрыў гэтую справу і арыштаваў абодвых малайцоў, якія пасьля кароткага адпіральства сазналіся ў зробленым злачынстве.

Уся вёска абурана фактам забойства і патрабуе ў дачыненьні злачынцаў самай суровай кары.

З.

Адказы чытачам

Кановічу (990). Для паступленьня у Менскі Архітэктурна-Дарожна-Будаўнічы Тэхнікум веданьне чарчэньне не абавязкова.

Яму-ж (991). У Гомельскую профшколу мэталістаў будуць прымаць па программе выдадзенай Наркамасьветай БССР.

Яму-ж (992). Дармовыя дадаткі трохмесячным падпісчыкам „Чырвонай Зьмены“ ужо ўсім разасланы. Калі ты дадатак не атрымаў, табе патрэбна навесьці спраўку у тым паштовым аддзяленьні, якім ты падпісваўся на „Чырвоную Зьмену“ і аб выніках паведаміць кантору Выдавецтва „Чырвоная Зьмена“.

Лебедзеву (993). Заяву трэба падаваць у адзін тэхнікум, а не ў некалькі, згаджаючы выбар тэхнікуму з сваімі нахіламі.

Яму-ж (994). Асобы, якія прыняты у тэхнікум, павінны аб гэтым паведамляць саветам тэхнікуму.

Яму-ж (995). Таварышы, скончыўшыя сямігодку і маючыя грамадзкі ўхіл, могуць паступіць у коопэратыўны тэхнікум (Віцебск).

Яму-ж (996). Землямернае аддзяленьне існуе пры Горацкай Сельска-гаспадарчай Акадэміі.

Лабусаву (997). У Менскую профшколу краўцоў можна паступіць з ведамі пяцігодкі.

П. (998). Адрас Віцебскага электра-мэханічнага тэхнікуму: Віцебск, рог Усьпенскай і Віткінага перавулку.

Яму-ж (999). Пры паступленьні ў навучальную установу неабходна прадставіць мэдыцынскае пасьведчаньне.

Новыя кнігі

Вышлі з друку і знаходзяцца ў продажы ва ўсіх магазынах Белдзяржвыдавецтва наступныя кнігі выд-ва ЦК ЛКСМБ „Чырвоная Зьмена“.

Н. Чаплін. „Год працы у новай палосе“ (даклад ЦК УсеЛКСМ на 5-й усесаюзнай конфэрэнцыі ЛКСМ). Старонак 1[illegible] цана 25 к.

Зборнік „Да дню вызваленьня Беларусі ад белапалякаў“ (матар'ялы для дакладаў, апавяданьні, п'есы, вершы). Старонак 116, цана 60 к.

Знаходзяцца ў друку

А. Шацкін. Даклад делегацыі УсеЛКСМ у Выкаўкоме КІМ'у. Цана 25 к.

Дуброўскі. „Кітай“ (палітыка эканамічны нарыс).

Н. Чаплін „Год працы ў новай палосе“ (на яўрэйскай мове).

Урачыстае зачыненьне шах. турніру працоўнай моладзі Менску

3-га ліпеня (нядзеля) у памяшканьні Дому Працасьветы (Камуністычная, 19) адбудзецца ўрачыстае зачыненьне масавага шахматнага турніру моладзі.

У праграме вечару: раздача прызоў, концэрт і кіно.

Пачатак а 7-ай гадзіне вечару.

Удзельнікі турніру могуць атрымаць білеты у рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“ з 5 да 7 гадзін вечару. Астатнія білеты разасланы па райкомам.

Рэд. газ. „Чырв. Зьмена“ і Турнірны Камітэт.

Адказныя рэдактары { **А. БАРАНЬНІКАЎ.** **А. КУРЦІК.**

Галоўлітбел № 24867 Менск, 2 друкарня БДВ.